# ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО

Арганізатару і кіраўніку нашага большэвіцкага друку БССР ЦК КП(б)Б ад арміі рабселькораў III усебеларускі рабселькораўскі з'езд шле палкае большэвіцкае прывітанне.

Пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта на чале з лепшым сталінцам тав. Гікало, ажыццяўляючы ўказанні нашага любімага вялікага Сталіна, БССР дасягнула выключна вялікіх поспехаў. Совецкая Беларусь стала квітнеючай рэспублікай вялікага СССР. Нашы поспехі ёсць рэзультат таржаства генеральнай лініі партыі, таржаства ленінска - сталінскай нацыянальнай палітыкі. Нашы поспехі ёсць рэзультат упорнай барацьбы супроць класавага ворага і яго агентуры. У барацьбе з усякага роду адхіленнямі ад лініі партыі, ад ленінскай нацыянальнай палітыкі расла, умацоўвалася і загартоўвалася армія рабселькораў і ўся большэвіцкая прэса.

Мы бязмежна шчаслівы, што жывем і працуем у эпоху вялікага Сталіна, у эпоху найвялікшага эканамічнага і культурнага росту нашай краіны. Мы бязмежна шчаслівы тым, што нас вядзе ад перамогі да перамогі вялікі Сталін, арганізатар і натхніцель соцыялістычнага будаўніцтва.

Мы бязмежна шчаслівы тым, што наша партыя стварыла такі друк, які з'яўляецца сапраўдным агітатарам, прапагандыстам і арганізатарам нас у барацьбе за пабудову бяскласавага соцыялістычнага грамадства.

Мы, дэлегаты III з'езда рабселькораў, ад імя ўсёй рабселькораўскай арміі клянемся Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б яшчэ больш павысіць класавую пільнасць, яшчэ больш рашуча змагацца за выкарчоўванне астаткаў разгромленага класавага ворага і яго агентуры.

Мы клянёмся яшчэ вастрэй адтачыць наша пяро, з тым, каб яшчэ мацней разіць класавага ворага і яго агентуру. Мы клянемся намагчы ўсе сілы для паспяховага завяршэння задач другой пяцігодкі, пяцігодкі пабудовы бяскласавага соцыялістычнага грамадства.

Мы клянемся што па першаму закліку нашай партыі і ўрада аддамо ўсё, а калі патрабуецца і жыццё для абароны нашай соцыялістычнай радзімы.

Няхай жыве наша любімая комуністычная партыя і вялікі правадыр усіх працоўных таварыш Сталін!

Няхай жыве наш большэвіцкі друк і яго рабселькоры!

Няхай жыве КП(б)Б на чале з лепшым сталінцам таварышам Гікало.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ